**103.** Прачытайце тэкст. Якія словы пацвярджаюць думку, што бор — гэта сям’я? Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

З аднаго берага ракі на другі заляцела некалькі бе..клапотных хваёвых семачак. З іх выраслі маленькія хвойкі.

Ішлі гады. Маладыя хвоі па..няліся высока ў неба. Вось ужо іх насенне па..хапіў вецер. Яно ўпала на беразе і дало свае ў..ходы. Паступова і гэтыя маленькія[ф] хвойкі па..раслі і падарылі свету сваіх дзетак. Так за шмат гадоў на беразе ракі ра..кінуўся вялікі бор.

А што адбылося са старымі хвоямі? Ніжнія галіны па..сохлі трохі, але дрэвы не ..трацілі сваёй прыгажосці[с]. Маладыя дрэвы шчыльнай сцяной а..ступілі сваіх бацькоў, каб засланіць іх ад моцных вятроў *(Паводле Т. Дамаронак)*.

Выпішыце з тэксту словы з прапушчанымі літарамі, растлумачце іх напісанне.

Знайдзіце ў тэксце і выпішыце апорныя словы. Вусна перакажыце тэкст па апорных словах.

**104.** Выканайце тэставую работу па тэме «Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны».

## § 17. Правапіс *і, й, ы* пасля прыставак

**105.** Разгледзьце малюнкі. Выкарыстоўваючы словы для даведкі, складзіце апавяданне па малюнках.





Правообладатель Национальный институт образования







Д л я  д а в е д к і: *выйсці, зайсці, прайсці, перайсці, узысці, сысці, падысці, абысці.*

Вызначце, ад якога слова і пры дапамозе якой марфемы ўтварыліся словы для даведкі.

Літара ***й*** пішацца замест каранёвага ***і*** пасля прыставак на галосныя: *пайсці, зайграць, прайсці, пайменна.*

Літара ***ы*** пішацца замест каранёвага ***і*** пасля прыставак на зычныя: *адысці, абыграць, безыменны, дэзынфармацыя, дэзынфекцыя.*

**106.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай.

У цэнтры горада Мінска ўжо шмат гадоў назад уз*(?)*шла яскравая Зорка. Гэта Зорка *(П/п)*ерамогі. Яна *(з/с)*зяе над знакамітай *(П/п)*лошчай *(П/п)*ерамогі. Пасля *(В/в)*ялікай *(А/а)*йчыннай вайны на гэтым месцы ў*(з/с)*вялі абеліск у памяць пра без*(?)*менных герояў.

Кожны дзень побач з абеліскам Зорка бачыць людзей. Яны пад*(?)*ходзяць да Вечнага агню і кладуць кветкі.

Вось і сёння на спатканне да гераічнай Зоркі пры*(?)*шло шмат народу. Людзі глядзяць на яе і шчасліва ўсміхаюцца[сн] *(Паводле Т. Дамаронак)*.

*абеліск*

Якая Зорка ззяе над плошчай у сталіцы Беларусі? Чаму людзі ўсміхаюцца, гледзячы на яе?

Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Абгрунтуйце свой выбар.



Правообладатель Национальный институт образования

**107.** Вызначце парадак дзеянняў пры напісанні ***й*** і ***ы*** пасля прыставак.

1. Знайдзі і графічна абазнач у прапанаваным слове … і … .
2. Вызначы, на … ці … заканчваецца прыстаўка.
3. Калі

**Прыстаўка заканчваецца НА**

| галосны | зычны |
|---|---|
| пішы ↓ | пішы ↓ |
| … | … |

**108.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

| | |
|---|---|
| 1) за вярсту *(ісці)*; | а) ‘сэканоміць час’; |
| 2) *(іграць)* ролю; | б) ‘марна прапасці’; |
| 3) *(іграць)* час; | в) ‘пазбягаць каго-небудзь ці чаго-небудзь’; |
| 4) *(ісці)* з дымам. | г) ‘мець значэнне’. |

Запішыце фразеалагізмы, замяняючы словы ў дужках дзеясловамі з прыстаўкамі ***па-, аб-, ад-, вы-***. Растлумачце напісанне ***і, й, ы*** пасля прыставак.

Каранёвая ***і*** захоўваецца на пісьме:

- калі гук [і] ўтварае склад: *за-**і**-ка, за-**і**-кацца, аб-**і**-нець, пра-ін-фармаваць, за-**і**-скрыцца*;
- пасля прыставак ***між-, звыш-, контр-, супер-, гіпер-***: *між**і**нстытуцкі, звыш**і**мклівы, контр**і**дэя, супер**і**нтэлект, гіпер**і**нфляцыя.*

**109.** Спішыце сказы, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне арфаграм.

1. Жыта ўз..дзе, зазімуе, а на лета закрасуе* *(В. Лукша)*. 2. Уклад дзядоў ніхто не пера..начыць *(Д. Бічэль)*. 3. Цімка[с], ці ад хвалявання, ці ад холаду, пачаў за..кацца *(В. Праўдзін)*. 4. У памяшканні, дзе знаходзіцца хворы, праводзіцца дэз..нфекцыя *(Паводле газеты «Звязда»)*.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым сказе.



Правообладатель Национальный институт образования

Каранёвая літара ***і*** ў словах з прыстаўкай на галосны служыць для абазначэння на пісьме двух гукаў — [й] і [і]. Вымаўляем: *за*[йі]*кацца*, *за*[йі]*скрыцца*, аб[йі]*нець*. Пішам: *заікацца, заіскрыцца, аб’інець*.

У словах з прыстаўкай на зычны каранёвая літара ***і*** выкарыстоўваецца для абазначэння гука [ы]. Вымаўляем: *між*[ы]*нстытуцкі*, *звыш*[ы]*дэйны*, *контр*[ы]*гра*. Пішам: *міжінстытуцкі, звышідэйны, контрігра*.

**110.** Запішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары.

Спад..лба, за..канне, раз..граць, супер..нтэлект, пера..сці, пра..нфармаваць, па..менна, між..нстытуцкі, за..нтрыгаваць, контр..дэя, ад..маць, пра..люстраваць, пры..сці.

З двума словамі (на выбар) складзіце словазлучэнні.

**111.** Выканайце тэставую работу па тэме «Правапіс ***і, й, ы*** пасля прыставак».

## § 18. Утварэнне слоў. Утваральная аснова (азнаямленне)

**112.** Прачытайце верш. Каму ён адрасаваны?

### Ці бачылі вы?

Ці бачылі вы,
пэўна, бачылі вы
прасторны[с] ды ціхі
праспект Баравы?
Не бачылі, кажаце,
нават не чулі?
А плошчу Бярозак
хоць не прамінулі?
Пра плошчу Бярозак
не чулі таксама?[сн]

А там жа такая
высокая брама*!
Не бачылі нават
прыпынку Грыбнога...
Тады зразумела:
вы страцілі многа.
Мы ў лес у нядзелю[ф]
хадзілі ўсім класам.
Шкада мне, што вас
не было з намі разам.

*В. Жуковіч.*



Правообладатель Национальный институт образования